Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Сын Беларуса

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12, п. 6. (Wileńska 12 m. 6).
Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 г. штодня апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад 9 да 3 г.

Выходзіць тры разы у тыдзень.
Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 2 злотыя
Для заграніцы удвая даражэй.

Няпрынятыя у друк рукапісы назад не вяртаюцца.
Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.
Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грош. і на 4 стр. 15 грош., за радок пэтыту у 1 шп.

№ 40. Вільня, Нядзеля, 14-га верасьня 1924 г. Год I.

„Antidotum“.

Жадаючы перад усей Эўропай паказаць сваю „толерантнасьць“ у адносінах да „сваіх“ немцаў, якія засыпываюць Лігу Народаў скаргамі на нялічаныя крыўды пад уладаю Польшчы, урад п. Грабскага завёў дужа цікаўную навіну ў пазнанскім і паморскім ваяводзтвах, у значнай меры заселеных немцамі.

Як паведамляе — і то з вялізарным абурэньнем — „Gazeta Warszawska“, Рада Міністраў пастанавіла стварыць пры пазнанскім і паморскім ваяводзтвах *польска-нямецкія рады*, зложаныя ў роўнай лічбе з палякоў і немцаў, пад старшынствам пачародна прадстаўнікоў аднае і другое нацыянальнасьці, і вось гэтыя рады будуць прадстаўляць кантрольны орган над дзейнасьцю ўлады пры ліквідацыі маемасьці нямецкіх грамадзян у Польшчы. Гэтыя рады мецімуць права апратэставаць кожную пастанову адміністрацыйнае ўлады ў вырашэньні пытаньняў аб тым, хто ёсьць грамадзянінам Польшчы, а хто—не, ды разам з тым і пытаньняў аб ліквідацыі маемасьці гэных асоб. Такія апратэставаныя пастановы польскае адміністрацыі рады могуць прыпыняць ажно да аканчальнага вырашэньня пытаньня аб грамадзянскіх правах дадзенае асобы правамочным прыгаворам найвышэйшае установы.

Мы ня ведаем, хто і як будзе тварыць гэныя рады і пастанаўляць аб асабовым іх складзе, дык трудна ацаніць іх вагу, і мы можам толькі апірацца на голасе нямецкае газэты „Deutsche Rundschau“, якая вітае гэты „скромны пачатак“ аздараўленьня польсканямецкіх адносінаў, *паскольку ён будзе правільна праводзіцца ў жыцьцё*. Затое-ж эндэцкая прэса ажно пеніцца ад злосьці, бачучы ў гэтай уступцы законным дамаганьням нямецкага насяленьня Польшчы выяўленьне „новага курсу“ ўрадовае палітыкі, — курсу „дужа небясьпечнага“ на пагляд польскага ваяўнічага нацыяналізму.

Усё-ж трэба прызнаць, што пастанова ўраду ў адносінах да немцаў — гэта спроба *практычнага зьдзейсьненьня* тых *загадаў*, якія зьмяшчаюць у сабе пастановы міжнародавага трыбуналу ў справе ўціску нямецкага насяленьня Польшчы. І мы затым адзначаем гэты факт, што ў адносінах да беларусаў, ня гледзячы на істнаваньне такіх-жа загадаў у польскай канстытуцыі і новых „языковых“ законах, ня бачым ніякіх спроб зьдзейсьненьня ўладай таго, што нам дае закон.

Наадварот: мы бачым, што польская ўлада ў Заходняй Беларусі ўжо надумала свайго роду „antidotum“—забясьпечваючы лек *процi* магчымасьці для беларусаў узяць тое, што забясьпечана законам.

Гэта—той *выняткові стан*, які пануе ў нас ня толькі фактычна, але і зусім *фармальна*. Мы зварачаем ўвагу нашых чытачоў на заяву адміністрацыйнае ўлады ў Беласточчыне, зробленую нашаму паслу Валошыну і зьмешчаную побач.

Справа ў тым, што „языковыя“ законы—гэта, як выразіўся Дэлегат Ураду ў Вільні, п. Роман, не абязываючыя, а факультатыўныя законы,—значыць, тасаваньне іх залежыць *ад жаданьня самога насяленьня*. Але гэтае жаданьне беларускага насяленьня ў адносінах, прыкладам, да школы ў роднай мове павінна быць выяўлена не паадзінокімі беларусамі асобна, а групова — арганізована: трэба, каб прынамся 40 бацькоў маглі *добра ўсьведаміць сабе сваё права*, а пасьля *свабодна згаварыцца*, мо' дзеля гэтага *свабодна зьбірацца* і пераконываць аб патрэбе беларускае школы сваіх аднасельцаў ці суседзяў з другіх вёсак, значыць *свабодна агітаваць*. І якраз у той мамэнт, калі істнаваньне ўсіх гэтых магчымасьцей і свабод зьяўляецца неабходным варункам правядзеньня ў жыцьцё законаў аб роднай школе,—у гэты самы мамэнт паліцыя пазбаўляе *свабоды гаварыць і зьбірацъ людзей дзеля іх усьведамленьня*—нават *нашых паслоў*! У гэты мамэнт нашы адміністратары выцягваюць нет ведама якім правам „*выняткові стан*“, а п. Грабскі назначае... *ваенных генерал-ваяводаў* дзеля „устрашэньня“ народу!

Вось той „antidotum“, які мае на мэце *зьвясьці „новы курс“* у нацыянальнай палітыцы ўраду *да нуля*.

І вось, каб наш народ як-найменш пацярпеў ад гэтага асаблівага „леку“, мы павінны выкаваць сабе моцны панцыр, ад якога адскаківалі-бы ўсе ўдары з боку тых, хто імкнецца да зьнішчажэньня нашага народу. Гэты панцыр, гэтая зброя—то-ж *наша сьвядомасьць, наша еднасьць, наша арганізованасьць*. І на кожнае выступленьне процi нашага народу, на кожын замах на нашыя правы мы павінны ўзмацовываць нашу нацыянальную і сацыяльную працу, працу пад перапратварэньнем міліёнаў распыленых па вялікім абшары „*жыхараў*“ Заходняе Беларусі ў *сьвядомае і добра арганізаванае грамадзянства*.

Забарона пасольскіх мітынгаў

7/IX—24 г. ў 1-ай гадзіне пасол Валошын сазваў у м. **Гарадку**, Беластоцкага пав. мітынг, каб зрабіць пасольскую справаздачу.

Сабралося тысячы з дзьве выбаршчыкаў.

Праз 15 мінут ад пачатку прамовы пасла Валошына зьявіўся камандант мясцовага пастарунку Зыгмунт Банькоўскі (№ 428) і заявіў, што ён павінен **забараніць гэты мітынг**, пазываючыся на загад Беластоцкага старосты.

Вельмі зьдзіўлены пасол, перарваўшы прамову, пайшоў на пастарунак і праз тэлефон атрымаў—ужо ад п. заступніка старосты—адказ, што гэтая забарона зроблена запраўды з яго даручэньня.

На запытаньне пасла, на якой падставе гэта забарона, — адказаў, што гэта зроблена—з прычыны „публічнае небясьпекі“...

8/9—24 г. у м. **Крынкі** той-жа пасол Валошын замэльдаваў пастарунковаму аб тым, што ён мае зрабіць у той дзень справаздачы мітынг. Але ў 1 гадзіне ў дзень, яшчэ ў часе абедні, на пагосьце зьявіўся камандант, знайшоў пасла Валошына і заявіў яму, што „**на моцы загаду міністэрства ўнутраных спраў на цэлыя Усходнія Крэсы ўведзены выняткові стан**“, дзеля чаго і забараняецца веча; аб ім трэба было заявіць загадзя—на 24 гадзіны наперад.

Да замежнае моладзі.

(„Вяліні паказ працы“).

„Kur. Pol.“, паведамляючы, што ад 12 да 24 гэтага месяца ў Польшчы будуць гасьціць 500 студэнтаў з 26 гаспадарстваў, — кажа, што яны маюць аглядзець найвялікшыя месты Польшчы—ў тым ліку і Вільню.

„Прыедуць людзі маладыя, а моладзь дужа ўражліва, што яна ўбача, тое і ў сябе дома расказа. Гэта будзе добрая прапаганда аб польскай культуры“.

Гэтак піша p. Widz. І дальш ён заклікае паказаць гэтай моладзі найлепшыя фабрыкі, капальні, гандлёвыя прадпрыемствы і „państwowe urzędy“.

Мілая моладзь! Праўда, табе пастараюцца паказаць усё, што маюць найлепшага, на'т штонебудзь і падфарбуюць. Але чы ўбачыш ты другую старану медалі? Чы ўбачыш ты нашыя гаротныя „Крэсы“, нашую бедную вёску, бедака селяніна, бедака работніка?

Можа хто з вас, мілая моладзь,—зарызыкуе, ўцячэ з гэтага кангрэсу ціхачом і пабача адваротную старану медалю. Каб-жа гэтае ўдалося! Убачылі-б ня мала...

Убачылі-б пустыя фабрыкі, майстроўні і — дзесяткі тысячаў галодных работнікаў...

Можа хто заглянуў-бы да нашых куратарыумаў і — ўбачыў сотні просьбаў аб беларускай роднай школе, схаваных у „ціхім вугалку“.

Убачылі-б і асьвету на Крэсах, — пустыя школы, сотні вучняў і—тысячы вучыцялёў!

А „państwowe urzędy“—мо' з вас хто паспрабаваў-бы атрымаць „довад асабісты“, альбо так што небудзь папрасіў-бы зрабіць (толькі, вядома, не падатак заплаціць!).

Можа хто з вас,—мілая моладзь, — абярнуўся-б мухай ці камаром—ды заляцеў-бы ў нашыя „instytucje społeczne“—вастрогі, дэфэнзывы, пастарункі паліцыі; было-б што расказаць у сябе дома,—толькі не расказывайце пры малых дзетках і супроць ночы... Вашым маладым, уражлівым душам цяжка было-б глядзець на „працу“ ў гэтых інстытуцыях, аб гэтай „працы“ вы ўжо трохі ведаеце з вядомага пратэсту найлепшых сыноў Францыі...

Ці пакажуць вам горы інтэрпэляцыяў у Сойме аб усялякіх гвалтах, зьдзеках, бяспраўях, якія робяцца ня толькі на Крэсах?

Ці не адрамантуюць дзеля паказу вам праваслаўнага сабору на Саскім пляцу, ці не паадкрываюць сотні зачыненых цэркваў і першагалепшага ўбяруць за сьвяшчэніка?

Ці не прывітае вас „гдзе-небудзь“ і „нашая“ беларуская дэлегацыя і не паднясе вам адрас ад імені „беларускага грамадзянства“ з нейкага Людвісаару, а ў гэтым адрасе будуць прасіць вас расказаць у сябе,—як „добра“ жывецца гэтаму „беларускаму грамадзянству“ пад „апякунчымі“ скрыдламі белага арла?!

Калі-б усё гэта (ды далёка яшчэ ня ўсё!) хто-небудзь убачыў з вашага ліку, мілая моладзь,—дык пэўна-б адказаўся-б ад опэраў, тэатраў, канцэртаў, банкетаў (чым вас будуць частаваць „васюю“, каб зрабілі тамака ў сябе добрую апінію!), ды злажыў-бы як хутчэй манаткі, абярнуўся птушкай—і больш ня езьдзіў-бы на кангрэсы—да нас...

Зязюля.

Пішыце ў газэту аб усім, што ў вас дзеецца: аб гмінных парадках, аб адносінах начальства, аб школах і навуцы, дый аб усякіх выпадках у жыцьці вашае ваколіцы. Пішыце коратка, але поўна і ясна, паказываючы акуратна: што, дзе, калі і кім зроблена, прозьвішчы і адрасы пакрыўджаных і крыўдзіцеляў. Канешне падпісывайце і свае імя—толькі для ведама Рэдакцыі!

Палажэньне работнікау у Польшчы.

Украінская часопісь „Голас Працы“, выдаваная ў Луцку, зварачае ўвагу на вельмі цяжкае палажэньне, якое вытварылася для працоўных масаў у Польшчы.

Лякаўт работнікаў у Горным Сьлёнску, які сыстэматычна праводзяць сьлёнскія прамыслоўцы пасьля заканчэньня забастоўкі, ня спыняецца. Не праходзе дзень, каб тут ці там ня выкінулі на брук колькісот работнікаў з аднаго толькі заводу. Гэткім чынам армія безработных усьцяж расьце, а разам з тым расьце і беднасьць. Палажэньне безработных — адчайнае, закон аб забясьпечаньні ад безрабоцьця на Горным Сьлёнску йшчэ ня мае сілы. Да таго-ж катастрафальнае палажэньне работнікаў робіць яшчэ цяжэйшым рост дарагоўлі. За апошнія часы ўстаноўлена, што цэны на спажыўныя прадукты ўзрасьлі на 50 проц., а на мяса дык больш за 50 проц. У дадатку-ж сьлёнскія прамыслоўцы, якія дастаўлялі і распрадавалі работнікам сваіх раёнаў на крэдыт—да найбліжэйшае выплаты заробку — бульбу, ад далейшае даставы бульбы адмовіліся, што бязумоўна выкліча павялічэньне цаны і бульбы, гэтага чуць не адзінага цяпер харчовага прадукту работнікаў.

Дый безрабоцьце — гэта ня выключнае зьявішча толькі Горнага Сьлёнску. У сувязі з сучасным эканамічным крызісам яно абхапіла ўсю Польшчу, а найцяжэй адчуваецца ткацкімі работнікамі Лодзі. Там лічба безработных — найвялікшая. Наскольні крытычным зьяўляецца сучаснае палажэньне работніцкае клясы ў Польшчы, найлепш паказуе факт, што нават урад, якому інтарэсы работнікаў ня вельмі ляжаць на сэрцы, ацаніўшы грознае палажэньне, распачаў акцыю дапамогі безработным. Аднак, гэтая акцыя—толькі капля ў моры, бо мінімальная дапамога дасталася толькі некалькім дзесяткам тысяч безработных на ўсю Польшчу, калі ў адным толькі Горным Сьлёнску лічба іх—шмат вялікшая.

Сучасны эканамічны крызіс і безрабоцьце ў Польшчы яшчэ далёка не дайшло да свайго найвышэйшага пункту, а сучаснае змаганьне работніцкае клясы ў Польшчы –гэта толькі ўступленьне, першая сутычка перад шмат вялікшымі і цяжэйшымі бітвамі, якія стаяць перад ею. Зьмяншэньне на 10 проц., заработнае платы і прадоўжаньне дня працы на Горным Сьлёнску, а разам з тым і ў Дамброўскім і Кракаўскім раёнах, — гэта не апошні замах на жыцьцёвыя інтарэсы работнікаў. Шмат вялікшае пагоршаньне варункаў працы йшчэ прыйдзе. Яно пачнецца ў Нямеччыне, дзе прамыслоўцы, перакладаючы ўвесь цяжар ваенных адшкадаваньняў на рабочую клясу, накінуцца на самыя асноўныя правы нямецкага пралетарыяту. Наступленьне нямецкіх прамыслоўцаў будзе сыгналам для наступленьня польскіх прамыслоўцаў, і гэтым разам абніжэньне жыцьцёвага роўня работнікаў будзе агульнейшае і шмат больш лютае, чым дагэтуль.

Ідучы на сустрэчу тым новым бітвам, якія будуць шмат цяжэйшыя за ўсе ранейшыя, работнікі павінны згуртаваць усе свае сілы, ўзмацаваць свае рады, каб адзіным фронтам адбіць усе наступленьні капіталу.

Лічба безработных.

Агульная лічба безработных дасягае ў Польшчы **305 тысяч душ.**

У Лодзі і лодзкім окрузе оказаліся пазбаўленымі працы 44 тысячы работнікаў, на Сьлёнску — 160 тысяч, у Дамброўскім окрузе — 19 тысяч, **у Беластоку — 10 тысяч**, у Варшаве — 8 тысяч.

Як Польшча забясьпечывае працаунікоу.

Орган P. P. S. у Дамброве падае 2 вельмі цікавыя дакумэнты.

Першы кажа аб чым, што Варшаўская дырэкцыя (чыгункі) асыгнавала свайму працаўніку, як адшкадаваньне за ўтрачанае ім у часе працы вока „рэнту“ ў разьмеры.. 2 злотых і 2 грошаў у год з выплатай памесячна!

Другі дакумэнт сцьвярджае, што работніку ў гуце, працаваўшаму 27 гадоў, была назначана „эмэрытура“... у ліку 80 грошаў на 2 месяцы! Якісь „сэрдабольны“ ксёндз ужо ад сябе дадаў... аж па 10 грошаў у месяц!..

„Якую-ж страшэнную вымову маюць гэтыя дакумэнты капіталістычнай патворнасьці!“— дадае ад сябе газэта..

А вось у „Работніку“ зьмешчаны яшчэ адзін дакумэнт гэтай „патворнасьці“ адносна да працаўнікоў.

Працаўнік Крэдытнага Банку у Варшаве, які пасьля 25-летняй працы быў „зрэдукаваны“, атрымаў „эмэрытуру“ у лічбе... 12.400 марак у месяц, што якраз хапае на тое, каб купіць 12 серчыкаў...

Цікава было-б запытацца, якія пэнсіі дастаюць паны дырэктары гэтага Банку, гуты і Дырэкцыі?!...

Проці мілітарызму.

Калі Трэці Інтэрнацыянал (камуністычны) абвясьціў на дзясятыя ўгодкі сусьветнае вайны „антымілітарыстычны тыдзень“, Другі Інтэрнацыянал (сацыялістычны) маўчаў і ўхіліўся ад выкарыстаньня гэтага мамэнту дзеля пратэсту проці рыхтаваных буржуазным сьветам новых — яшчэ страшнейшых войн у будучыні. А перад усім сацыялісты Другога Інтэрнацыяналу гэтым паказалі, што у магчымай вайне іх „радзімае“ буржуазіі з Саюзам Сацыялістычных Радавых Рэспублік яны ніякіх перашкод рабіць ня будуць.

Але — noblesse oblige: назваўся сацыялістам, дык трэба-ж апраўдаць нечым гэтае імя! Вось-жа, і яны ўрэшце надумаліся зрабіць выступленьне проці мілітарызму і падгатоўкі новых войн, якая адбываецца... пры іх-жа ўчасьці ў урадах Англіі, Францыі, Нямэччыны!

У Польшчы Цантральны Камітэт П. П. С. выпусьціў адозву, у якой чытаем:

„Сацыялістычны і прафэсіянальны Інтэрнацыянал, паразумеўшыся, пастанавілі, каб у дзень 21 верасьня работніцкая кляса ўсіх краёў выявіла сваю моцную волю ўмацаваць і паглыбіць мір, каб усюды выступіла проці палітыкі, якая нясе пагрозу вайны, каб дала доказ міжнародавае салідарнасьці, якая праз мірнае і брацкае супрацоўніцтва пралетарыяту ўсіх краёў вядзе да лепшае будучыны.

„21 верасьня работніцкая кляса асудзіць, як буржуазны, так і радавы мілітарызм. Работніцкая кляса не дапусьціць да таго, каб ці то буржуазныя дзяржавы, ці Радавая Расея выклікалі ваенную навальніцу“.

На „крэсавых дажынках“.

(Гл. № 39 „Сына Беларуса“).

З вялікім сумам і абурэньнем „Kur. Por.“ сцьвярджае, што беларускі хлоп зусім раўнадушна глядзіць на барацьбу ўлады з так званымі „дывэрсыйнымі бандамі“, або нават яшчэ больш — „памагае гэтым бандам хавацца ад пагоні“...

„Беларускі селянін,—сцьвярджае газэта,—дзякуючы адносінам, пануючым на Крэсах, **страціў да Польшчы даверые,** і цяпер больш, чым калі, стаўся **падатным** на **рэвалюцыйныя, ці наагул варожыя да Польшчы ўплывы**“...

„Дрэнна на нашых беларускіх землях“, патэтычна кліча аўтар разглядаючае стацьці!

І ў гэтай запраўды трафна — бо ўнутрана супярэчнай—формуле зьмяшчаецца, можа, ня толькі сцьверджаньне факту, але і прычына гэтай „дрэннасьці“. Бо калі-б палякі менш лічылі гэтыя „Крэсы“ **„сваімі“**, а больш **беларускімі**, дык можа яны і былі-б трохі больш „нашымі“...

Але пакуль Польшча глядзіць на „свае Крэсы“ з пункту гледжаньня „państwowego“ ці лепш—проста „панскага“, датуль будзе ня лепш, а горш!

Аўтар кажа, што ніколі ня трэба забывацца, што ўся „крэсавая справа — гэта адвечная барацьба Польшчы з Расеяй за гэтыя землі“. Але ён зусім ня можа зразумець таго, што **цяпер перамагчы ў барацьбе можа толькі старана, якая будзе сьвядома і шчыра памагаць беларускаму народу ў яго імкненьні да незалежнасьці, бо толькі тая меціме прыяцеля ў вольным народзе беларускім!** Ня гледзячы на ўсю „левіцовасьць“ газэты, аўтар не разумее яшчэ таго, што ніводзін народ, пачуўшы раз сябе **сьвядомай асабістасьцяй**, ня можа ўжо стацца „ўласнасьцю“ — „нашым“ для ругога!.. „Нашыя беларускія Крэсы“—стольні абмылак, сколькі слоў!

Згодна з ведамым рэцэптам нашага віленскага „Слова“: „разьдзяляць украінцаў і беларусаў“ і тварыць для кожнай з гэтых нацыянальных адзінак у Польшчы „асаблівую палітыку“, аўтар кажа, што гэткая палітыка дыктуецца—„вялікай розьніцай у дасьпеласьці і сьвядомасьці“ абодвух народаў. „Беларуская справа мае іншую гісторыю, іншыя сацыяльныя балячкі, як украінская“. На гэтай розьніцы паміж беларусамі і украінцамі аўтар прапануе вытварыць і розьніцу паміж імі, як гэта маюць на думцы і нашыя віленскія палітыкі з „Слова“...

Але ж гэта—зусім відавочны абсурд! — Патрэбы народу ўсюды—аднолькавыя: для ўсіх патрэбна **самастойнае** будаваньне свайго жыцьця, і як украінскія, таксама і беларускія паслы зусім выразна кажуць тое-ж самае.

„Напрыклад, кажа аўтар, — ніводнаму беларусу ня прыйдзе ў галаву дамагацца стварэньня беларускага унівэрсытэту, чаго з гэткай энэргіяй трэбуюць украінцы“. Для беларусаў аўтар прапануе перадусім вырашыць „справу зямельнай раформы на карысьць мясцовага насяленьня“. „Тады і... справа калянізацыі Беларускіх Крэсаў праз **польскі** элемэнт страціць усю сваю вострасьць“.

Але-ж аўтар забываецца аб тым, (—бо ён ня мог-жа ня чуць аб гэтым!), што ў Менску ўжо колькі гадоў працуе **Беларускі Унівэрсытэт, як дзяржаўная установа,** і што школьная, а ў частцы унівэрсытэцкая крэсавая палітыка Польшчы — адзін з найвялікшых грахоў, забіўшых „польскую рацыю стану“ на „Крэсах“.

„Дэмакратычная шчырасьць“ аўтара вельмі добра выяўляецца і ў тым, што „зямельнай рэформе на карысьць бнларускага мясцовага насяленьня“ ён дае шляхотную мэту — **прыкрыць фактычную калянізацыю „Крэсаў“ польскім элемэнтам,** г. ё. — тое самае асадніцтва, ад якога ніяк ня можа адмовіцца ніводная польская партыя, асабліва **на левым** флангу польскага грамадзянства...

Вельмі цікавыя рэвэляцыі робіць аўтар адносна надзяленьня зямлёй тых беларусаў, якія ваявалі ў польскай арміі.

Аўтар сцьвярджае, што „зямлёй надзялілі **амаль ня выключна элемэнт наплыўшы, чужы, а абмінулі ў гэтай акцыі элемэнт мясцовы — краёвага вайсковага ахвотніка**... Абмінулі, зразумела, дзеля таго, што гэта былі не палякі, але беларусы...

Аўтар лічыць гэта „вялікай абмылкай“. Аўтар сцьвярджае, што ў адным толькі Вялейскім павеце ён асабіста ведае **да паўсотні** гэткіх дабравальцаў, якія мелі ўсе правы на зямлю, але гэтай зямлі, **„абяцанай ім урачыста адозвай ураду ў 1920 г., не атрымалі“**. Аўтар—пілсудчык ня хоча толькі дадаць, што гэтая адозва, **ашукаўшая** аддаваўшых сваё жыцьцё на карысьць Польшчы беларусаў, напісана і падпісана была **самім панам Пілсудскім**...

Аўтар кажа ў канцы, што можна без канца прывадзіць сьпісак абмылак польскай улады на „Крэсах“.

Але што-ж радзіць рабіць ён сам, каб папраўіць палажэньне?..

І вось тут раскрываецца ўва ўсей паўнаце і багацьці—пустата і ўбожства палітычнай думкі аўтара.

Засьцярагаючыся проці лячэньня „крэсавага зла“ **фразай**, ён якраз радзіць распачаць лячэньне „польскай рацыі стану“ на Крэсах—паваротам да ўжо даўно выветрыўшайся „Ягелёнскай ідэі“. Ён прапануе пачаць гэтую працу „санацыі“—з умацаваньня... **кадраў польскага чыноўніцтва на Крэсах элемэнтам ідэйным, для якога лёзунгам была-б толькі „польская рацыя стану“**...

Вось якім аружжам польская лявіцовая думка прапануе „перамагаць напор і ўплыў на Захад палітычнай думкі і чыну Масквы“...

Лек для „польскай справы на Крэсах“ — у тым, каб—1) **ашукаць беларускае сялянства зямельнай рэформай, падлажыўшы пад яе спрытна і асьцярожна тое-ж асадніцтва.** 2) **навадніць „нашыя Беларускія Крэсы“ яшчэ больш выключна польскім чыноўніцтвам, якое-б мела мэтай „Ягелёнскую ідэю“ і „польскую рацыю стану“.** 3) Па магчымасьці, не адмаўляючы зусім, (бо гэта „пагражае ўтратай уплываў польскай рацыі стану“). але як мага **—адрываць ад „лёзунгаў палітычна-нацыянальных“** і, наадварот, **нахіляць да „пастулятаў гаспадарчых“ беларускі народ і яго інтэлігенцыю“.**

Вось тая „новая“ праграма, якую прапануе ўраду орган польскай лявіцы. Каротка кажучы, газэта прапануе—**адцягнуць беларускі народ ад імкненьня да самастойнага нацыянальнага і палітычнага жыцьця, ад самадзейнасьці, самаўраду, аўтаноміі** і ўрэшце незалежнасьці, падсунуўшы заместа гэтага — „гаспадарчыя карысьці“ ў Польшчы. Але разам з тым яна радзіць пазбаўляць **і гэтых гаспадарчых карысьцяў,** магчымых толькі для сялянства **на сваей зямлі,** — бо яго беларускую **зямлю ўсё-ж такі аддае польскаму асадніку**!..

І так—зямля і „гаспадарчыя карысьці ў Краі — **польскаму асадніку,** а нацыянальна-палітычнае **жыцьцё і ўся самадзейнасьць—„ідэйнаму“ польскаму чыноўніку**“!.

Вось **беларуская праграма польскай лявіцы,** прадстаўніком якое зьяўляецца газэта „Kur. Por.“, — гэты лейб-орган „самога“ Язэпа Пілсудскага..

Можна толькі падзякаваць аўтару „за шчырасьць“, хаця, каб раскапаць запраўдны зьмест яго думкі спад наваленых на яе слоў і фразаў, — трэба было шмат часу...

В.

„Генарал-губарнатары на Крэсах“.

Пад гэткім загалоўкам „Robotnik“ зьмяшчае артыкул аб нованазначаных двух „крэсовых“ ваяводах—ваенных генаралах.

Газэта цяпер ужо шмат больш трывожна адняслася да гэтай „рэформы“, чым у першай сваей заметцы, і ўжо лічыць гэтае „здарэньне лішне непакоючым, каб можна было папросту пагадзіцца з гэтым фактам і прайсьці міма яго“.

Перадусім мы даведаліся з артыкулу аб тым, што ў гэтым стварэньні гэнарал-ваяводаў, ці генарал-губэрнатараў, як самая думка, так і **выбар асобаў**—твор вельмі ўплывовага ў урадзе п. Грабскага—ген. Сікорскага.

Добра асьвядомленая газэта кажа далей, што абодва генаралы назначаны адміністратарамі зусім ня дзеля таго, што яны маюць нейкія адміністрацыйныя таленты, ці дасьлед: зусім не... „Аб адміністрацыйна-палітычным геніі ген. Янушайтіса і ген. Альшэўскага мы ня чулі нічога“. Наадварот: напрыклад, аб ген. Янушайтісу газэта ведае, што ён быў адным з учасьнікаў вядомага „рэакцыйнага замаху на істнуючы дзяржаўны лад“—(ці не фашыстаўскай арганіз. П.П.П.?), што вельмі сумна сьведчыць аб яго палітычным розуме“, а яшчэ сумней — аб яго „прыхільнасьці да законнасьці і наагул—да прававога парадку“.

Абодвух генералаў паслалі на „Крэсы“, каб яны „правілі **па ваеннаму**“; іх выбралі **толькі дзеля таго, што яны — вайсковыя** генаралы! Дык газэта слушна баіцца, што на „Крэсах“ будзе цяпер „мундзір загадываць галаве, але не галава мундзіру“. Яна баіцца, каб „Канстытуцыя на Крэсах не пайшла ў кут, каб законы ня былі заперты ў скрыню, а ключ ад яе ня быў закінуты так, каб яго не знайшлі“. Баіцца, каб на „Крэсах“ заместа нармальнага разьвіцьця грамадзкага жыцьця і рэформ, не запанаваў бышам усемагутны генерал-

скі загад". Газэта чула, што ўрад мае даць гэтым „мундзірам" нейкія **вынятковыя паўнамоцтвы**, дык „гэта-ж будзе бясправўна", выклікае газэта. Мусіць, яна моцна перакананая, што **пры цывільных** „візытках" ці „сурдуках", якія дагэтуль „загадывалі галаве" на „Крэсах", было ляпей,—быў „праўны лад", а не адно бясправўе?!

Але слушна заводзіць газэта, што—„не зрабіўшы ніводнай запраўды карыснай для насяленьня рэформы, ня зьняўшы ніводнае балячкі, — пачаць з таго, каб страшыць народ „генаральскім мундзірам", пачаць проста з мілітарызацыі адміністрацыі, гэта-ж даказывае толькі **адсутнасьць усякай палітычнай думкі і шчырага жаданьня запраўды грунтоўна лячыць і паляпшаць адносіны на „Крэсах"**.

„Назначэньне генарал-губэрнатараў — не лячэньне, але—**канавальства** — паводле даўнейшых прыкладаў царскага ўраду".

Але-ж ізноў—чым лепшы „канавал ў візытцы",—запраўды, ня ведаем...

З газэт.

Палякі аб асадніцтве.

Орган мясцовых „нэграў" „Dzieńnik Wileński" друкуе цікавыя карэспандэнцыі з Дунілавіцкага павету, у якіх ёсьць, напрыклад, гэткая ацэнка „праменяваньня польскае культуры" на нашых крэсах.

Вось, што пішацца там аб асадніцтве:

„Значэчы мясцовыя адносіны і зямельны голад у мясцовага сялянскага малазямельнага насяленьня і масы зусім беззямельных сялян (з былых батракоў), якія цяпер пакінуты папросту на волю пёсу (разумей: трэба вярнуць абшарнікам зямлю—тады гэтыя батракі ізноў знойдуць працу, хлеб і страху! —*Рэд.*), — маю адвагу сумлявацца, ці дзяржава будзе мець якую карысьць з гэтага асадніцтва. Я шчыра высказаў свае сумляваньні розным польскім патрыётам на Крэсах, і тыя ўсе сцьвярджалі, што *асадніцтва не дасягае мэты, без патрэбы дражніць мясцовае насяленьне, а саміх асаднікаў, у разе якой завірухі, наразіць на паважную небясьпеку.* Адно ўжо пэўна: *непрыязьнь мясцовага насяленьня да асаднікаў—агромная*"...

А вось што той-жа патрыёт піша аб „школьніцтве на крэсах":

„*Ня меншай балячкай зьяўляецца на крэсах і школьніцтва.* На паперы яно мо' й выглядае паважна, але ў запраўднасьці *яно-ж папросту ў адчайным стане*! Паводле апініі мясцовага насяленьня *асабісты склад вучыцялёў* (*польскіх!—Рэд.*) *не дарос да вышыні задачы ані з боку навучнага ўзгадаваньня, ані з боку маральнай вартасьці.*—На пачатку бралі кожнага, хто толькі прасіўся, ня гледзячы на „кваліфікацыі"...

Ведама-ж, хай будзе злодзей, ці анальфабэт, ці нават—і тое і другое разам,—абы быў паляком і вучыў папольску,—каб толькі ня пусьціць беларускага вучыцеля да свайго роднага народу.

Палітычныя падзеі.

Ізноў абмен нотамі паміж Польшчай і ССРР.

Польскае агенцтва падае, што радавы ўрад прыслаў адказ на польскую ноту ў справе нападу на Стоўпцы. У ноце гэтай, поўнага тэксту якой мы яшчэ ня маем, радавы ўрад катэгарычна пярэчыць заяве польскага ўраду, што бандыты прыйшлі з тэрыторыі ССРР. Урад ССРР сцьвярджае адсутнасьць у Менску нейкай бандыцкай арганізацыі, якая б кіравала гэтымі нападамі. Якраз наадварот — радавы ўрад сам закідае польскаму, што з польскай тэрыторыі сыстэматычна пераходзяць на радавы бок польскія банды, тэрорызуючы мясцовае насяленьне...

У сваім часе старшыня радавай дэлегацыі на англа-расейскай канфэрэнцыі, Ракоўскі, прачытаў дэклярацыю аб Галіччыне, прызнаць якую часткай Польшчы ССРР рашуча адмовіўся, апратэставаўшы і вырашэньне гэтай справы „Радай Амбасадораў".

Польскі ўрад, у зьвязку з гэтым, заявіў пратэст проці гэтай дэклярацыі, пазываючыся на Рыжскі Трактат, паводле якога ССРР зрокся ўсялякіх правоў на ўсе тэрыторыі, што ляжаць на заход ад „рыжскай" граніцы, і на тое, што справа Галіччыны вырашана ў міжнародавым парадку.

Радавы ўрад адказаў на гэта нотай, у якой заявіў, што зусім не прызнае справу Галіччыны вырашанай у міжнародавым парадку. Што датычыць Рыжскага Трактату, дык ён кажа аб незаінтэрасаванасьці ССРР тэрыторыяй па той бок граніцы, але радавы ўрад інтэрасуе лёс украінскага насяленьня Галіччыны, якому польскі ўрад павінен даць магчымасьць карыстацца правам самаазначэньня.

І гэта — зусім у духу Рыжскага Трактату...

Соймавая камісія ізноў едзе на „Крэсы".

Соймавая камісія ізноў 10 верасьня выехала на „Крэсы". Камісія мае дагледзіць на мейсцы, ці добра жывецца на „Крэсах"... паном паліцыянтам, як будуюцца для іх казармы і „палацыкі"...

„Адбудова Крэсаў" ідзе па ўсіх парах!"

Літоўская прэса аб віленскай справе ў Лізе.

Уся літоўская прэса горача занялася справай Віленшчыны, якая разглядаецца падкамісіяй Лігі. Газэты тлумачаць зьмест літоўскага дамаганьня.

Як ведама, літоўская дэлегацыя падняла пытаньне аб правамоцнасьці Рады Лігі рашаць аканчальна віленскую справу. Калі камісія адкажа на гэтае пытаньне адмоўна, тады ўся справа павінна будзе перайсьці на агульнае сабраньне Лігі і будзе разглядацца ім можа цяпер-жа. Калі камісія адкажа сьцьвярджаюча, дык літоўская дэлегацыя патрэбуе — перадаць спор паміж Літвой і Лігай на аканчальнае вырашэньне ў Гаагскі Трыбунал, адмовіць чаго Ліга ня можа.

Літоўская прэса кажа, што ёсьць пэўныя знакі таго, што віленская справа можа прыняць памысны для Літвы абарот. — Нэйтральныя дзяржавы, з Швэцыяй на чале (вельмі ўплывовы яе дэлегат — Брантінг — вялікі прыхільнік і абаронца малых народаў!) будуць за Літву. Англійцы таксама разумеюць літоўскую крыўду. Наагул — адносіны да Польшчы вельмі зьмяніліся ад часу пастановы Рады Лігі ў віленскай справе. — Увесь сьвет добра паінфармаваны аб тым „міры" і „спакою", якія пануюць на „Крэсах" пад польскім панаваньнем. Пасылка „генарал-губэрнатараў" з спэцыяльным корпусам на „ахову Крэсаў" — найляпей задэманструе перад Лігай стан рэчаў на „Крэсах" і асьветліць віленскую справу лепш, як усялякія скаргі...

Таксама — „бандыты".

„Літоўскае агенцтва" падае, што ў апошнія часы ў раёне Троцкага павету з польскага боку пачалі пераходзіць граніцу бандыцкія атрады, якія зрабілі некалькі нападаў па мясцовае насяленьне... Улада прыняла рашучыя меры...

Манёўры літоўскай арміі.

На 10 і 11 верасьня ў раёне Панявежу, Шаўляў і Уцяны назначаны вялікія манёўры літоўскай арміі, у якіх прымаюць участце ўсе роды аружжа.

Літоўска-латвійскае зблізэньне.

„Таварыства Літоўска-Латвійскага Зблізэньня" выслала да Лігі Народаў пастанову Літоўска-Латвійскага Кангрэсу ў справе Віленшчыны. Гэтая пастанова сцьвярджае, што „Вільня шляхам гвалту была занята палякамі і што народы літоўскі і латвійскі павінны прылажыць усе сілы, каб Літва атрымала сваю старую сталіцу"... „Dz. Wil."

Ізноў страшэнны выбух у Румыніі.

Каля Букарэшту (сталіца Румыніі) ўзарваны ў паветра цэлы форт, важная частка ўкрапленьняў сталіцы. Страты агромныя, бо ў форце былі вялікія склады амуніцыі і выбуховых матар'ялаў.

Вось як лёс карае Румынію за тое, што яна прымусам трымае і катуе насяленьне Бэсарабіі, не даючы яму — волі да самаазначэньня.

Канец грузінскага паўстаньня.

„Роста" апавяшчае, што паўстаньне ў Грузіі зьліквідавана. 24 арганізатары, у тэй лічбе 3 сябры Ц. К. мяншавікоў — Гомэрылі, Джугелі і Сабашвілі, арганізатар тэрорыстычных актаў Цаганія і прыбыўшы з-за граніцы арганізатар паўстаньня Дэнтэрадзэ,— разстраляны. Рэшта сябраў Камітэту Незалежнасьці Грузіі з князем Андроньнікавым на чале — выдала адозву, у якой заяўляе аб згубнасьці паўстаньня для грузінскага народу і аб распушчэньні Камітэту.

Грузінскія паўстанцы зьвярнуліся да Мак-Дональда.

Старшыня паўстанчага ўраду ў Грузіі зьвярнуўся да Мак-Дональда, каб той выступіў з пасярэдніцтвам і нахіліў маскоўскі ўрад, каб згадзіўся аддаць грузінска-расейскую справу на рашэньне палюбоўнага суду.

Генаральнае адступленьне гішпанскіх войскаў у Марокко.

З Лісабону наказуюць, што гішпанскія войскі пачалі генаральнае адступленьне. Галоўная група ўрадавых войск акружана паўстанцамі...

Вось рэзультаты „крэсавай" палітыкі гішпанскага генаральскага ўраду.—Не памаглі „hiszpańskiej racji stanu", але — якраз наадварот — хутчэй усяго патапілі яе—тыя самыя генаралы, якіх цяпер... і ў сябе дома народ пачне гнаць..

„Рэвалюцыя" ў Чылі.

Пішуць, што „зьмена габінэту" ў Чылі адбылася дзеля таго, што ўрад быў скінуты паўстаўшай ваеннай партыяй.

Сэсія Лігі Народау.

Англія аб арбітражу.

У гутарцы з журналістамі прадстаўнік Англіі ў Лізе Народаў, лёрд Пармур, заявіў катэгарычна, што, калі-б якая дзяржава адмовілася падпарадкавацца арбітражнаму (трацейскаму) суду і пачала-б ваенныя крокі, дык Англія аддала-б усе свае марскія сілы — тэй старане, на якую зроблены напад.

У справе разбраеньня.

Дэлегат Вэнгрыі выступіў на паседжаньні Лігі з пратэстам проці таго, што, на падставе „мірных трактатаў" толькі пераможаныя дзяржавы ... ліся разбраеньню, але пераможцы — наадварот — толькі павялічылі збраеньні. Гэта стварае для Вэнгрыі нячуванае палажэньне, з якім яна памірыцца ня можа...

Гэтая заява вельмі абурыла Малую Антанту, якая, як ведама, якраз зьяўляецца па Вэрсальскаму Трактату „стражнікам" Вэнгрыі...

Вось так Ліга!..

Югаславія пагражае выйсьці з ліку сябраў Лігі Народаў—за тое, што Трыбунал Справядлівасьці ў Гаазе рашыў не на яе карысьць справу прыналежнасьці нейкага манастыра сьв. Наума, скрыўдзіўшы тым яе „сувэрэннасьць".

Грузінская справа ў Лізе Народаў.

Пат падае:

Англійская, француская і бэльгійская дэлегацыі ўнясьлі ў Сабраньне Лігі рэзалюцыю, у якой дамагаюцца ад Лігі пасярэдніцтва паміж Грузіяй і Расеяй дзеля спыненьня праліцьця крыві.

Рэвалюцыя у Кітаі.

Адозва Сун-Ят-Сэна.

Вядомы правадыр кітайскага вызваленьня Сун-Ят-Сэн выпусьціў адозву, у якой адкрыта высказываецца за бальшавікоў і паказывае на расейскую рэвалюцыю, як на прыклад для кітайскага народу, калі ён паставіў сабе мэтай вызваліцца ад чужаземнага засільля.

Кітайская хатняя вайна.

Дыктатар Манчжурыі Чын-Сэ-Лін аб'явіў вайну цантральнаму ўраду ў Пэкіне.

Паслы вялікіх дзяржаў выслалі кітайскаму ўраду новую ноту, у якой дамагаюцца стварэньня ў раёне Шанхаю „нэйтральнага пасу"... Гэта-ж значыць—дамагаюцца ад Кітаю адмовы ад правоў на яго ўласную тэрыторыю!

Кітайскі адказ.

Пэкінскі ўрад, як кажуць, пад націскам ССРР, адмовіўся прызнаць у раёне Шанхаю „нэйтральны пас", як гэтага дамагаліся ў сваей ноце дзяржавы. Гэта значыць, што армія, якая йдзе на Шанхай, будзе яго браць сілай...

Сілы манчжурскай арміі.

У распараджэньні аб'явіўшага вайну Пэкіну дыктатара Манжурыі—добрая і моцная армія, складаючаяся з 21 брыгад пяхоты і 4—кавалерыі.

ХРОНІКА.

Водгукі выхаду беларусаў з „Вызваленьня". Паслы Бальлін, Рагуля і інш. падалі інтэрпэляцыю да Міністра Унутраных Спраў з прычыны канфіскацыі камісарам ураду на м. Варшаву дэклярацыі паслоў-беларусаў Бальліна і Шакуна пад загалоўкам „Dla czego wyszliśmy z Wyzwolenia".

Зьмест—той самы, што і ў друкаванай у нас пабеларуску дэклярацыі гэтых паслоў.

„Pour la liberté des peuples opprimés par la Pologne" („За волю ўціснаных Польшчай народаў"). Пад такім загалоўкам выйшла ў Парыжу кніжачка, выданая Украінска-Беларуска-Літоўскім Камітэтам. У кніжачцы зьмешчаны, апрача прадмовы, тры рэчы: „Пратэст проці белага тэрору ў Польшчы", падпісаны выдатнейшымі дзеячамі Францыі з Пэнлевэ і Эрыо на чале; артыкул Віктара Баша „Белы тэрор у Польшчы", надрукаваны ў газэце „l' Ere Nouvelle"; „Прызыў да цывілізованага сьвету", падпісаны ад імя ўкраінцаў—д-рам М. Лозінскім, ад імя беларусаў—В. Ластоўскім і ад імя літвіноў—Л. Вайліонісам.

Запярэчаньне Камісара Ураду на м. Вільню. Рэдакцыя нашае газэты атрымала гэткі дакумэнт, які, згодна з законам, друкуем поўнасьцю:

„У № 36 часопісі „Сын Беларуса" з 5 верасьня г. г. была зьмешчана заметка аб кантролі беларускай кнігарні пры Завальнай вул. № 7 пад загалоўкам „Разгром беларускай кнігарні".

„Заметка гэтая падае весткі прост фальшывыя.

„Няпраўда, што кантроль адбываўся некалькі гадзін, што паліцыя абярнула ўсё ў „стог сена", разрывала вязанкі з кнігамі і кідала на падлогу, як гэта кажа памянёная заметка. Затое праўда, што кантроль трываў няпоўную гадзіну ад 11½ да 12½ гадз. папалудні, што ў памяшчэньні кнігарні ніякіх кніжак, апрача двух вязак з уложанымі камплектамі беларускіх газэт, не пераглядалі. Пры гэтым, выбраўшы шуканыя сканфіскаваныя экзэмпляры, пачкі ў парадку зложаны на тым жа месцы, ўважаючы, каб нумары газэт ішлі ў парадку па чарзе. У надвале кнігарні перагледжаны дзьве вязкі газэт і некалькі пачкаў з кнігамі. Ня было патрэбы „разрываньня пачак", бо на кожнай з іх быў надпіс, які друк у ёй знаходзіцца, калі выданы і г. д.

„Няпраўда, што забраны нумары газэт, ніколі не канфіскаваных. Затое праўда, што ў кнігарні знойдзены гэткія друкі: 1) каля 300 экзэмпляраў заарыштаваных нумароў часопісі „Вольны Сьцяг" № 16 і 17 (арышт зацьверджаны — пісьмо п. Пракурора з 13.X.23 г. № 10166, справа № 16 йдзе); 2) каля 400 экз. часопісі „Наш Сьцяг" № 7 (арышт зацьверджаны, — пісьмо п. Пракурора з 21.VII 23 г. № 5335); 3) каля 100 экз. заарыштаванае і зачыненае часопісі „Голас Беларуса" № 15;

(арышт зацьверджаны, — пісьмы п. Пракурора з 18.X.23 г. № 10466 і з 10. XI. 23 г. № 8927); 5) 10 экз. часопісі „Наша Будучына“ № 2 (арышт зацьверджаны, пісьмо п. Пракурора з 13.II. 1922 г. № 1411; 6) 15 экз. часопісі „Змаганьне“ № 1 (арышт зацьверджаны, пісьмо з 29. XII. 1923 г. № 1240 DD); 7) экзэмпляры заарыштаваных часопісей „Новае Жыцьцё“ № 1, „Крык Праўды“, „Беларускі Гоман“—аднаднеўкі, „Саха“ № 1 (арышты зацьверджаны,—пісьмы п. Пракурора з 25.X.23 г. № 2742/23, і з 2.VII. 23 г. № 4847/ДК, а также з 8.V.23. № 3102); 8) каля 80 экз. заарыштаваных нумароў часопісі „Сын Беларуса“ № 15 і 28 (справа йдзе).

„Апрача таго я заарыштаваў у кнігарні гэткія друкі, маючыя выразныя адзнакі праступства паводле арт. 128, 129, 263 і 154 К.К.: 1) каля 400 экз. часопісі „Незалежная Беларусь“ і некалькі экзэмпляраў часопісі „Беларуская Думка“; 2) каля 100 экз. часопісі “Грамадзянін“ № 5; 3) каля 40 экз. часопісі „Вольная Беларусь“ № 36; 4) каля 30 экз. часопісі „Грамадзянін“ № 31; 5) экзэмпляры часопісі „Беларускі Студэнт“, якая ня мае паштовага дэбіту; 6) беларуская часопісь „Сьцяг“ № 1 і 3, выдаваныя ў Коўні; 7) экзэмпляры часопісей: „Савецкая Беларусь“ № 6—Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае Партыі Літвы і Беларусі, „Беларус Вайсковы“, выд. у Коўні; 8) каля 300 экз. друку п. н. „Polska okupacja na Białorusi“.

(—) **К. Вімбор,**
Камісар Ураду.

Пісаньне мэтрык у праваслаўнай царкве і беларуская мова.

Не варочаючыся назад у часы гістарычныя, калі мова беларуская бязумоўна была мовай гаспадарственай і ужывалася ў-ва ўсіх установах Беларуска-Літоўскай Дзяржавы, будзем гаварыць толькі аб сучасным мамэнце, калі мова наша хвалямі жыцьця паднята да прызнаньня яе ў Польскім Сойме і Сэнаце — роўнапраўнай мовай на Крэсах. Гэта мусіць адбіцца і ў тых установах, у якіх дапускаецца ўжываньне мовы тутэйшай; так яшчэ ў 1923 г. Тымчасовымі Правіламі Польскай Рэспублікі для праваслаўнай царквы ў Польшчы, § 7, дазваляецца ўжываньне **тутэйшай** мовы пры пісаньні мэтрык у праваслаўнай царкве побач з мовай польскай. Духоўнымі Кансісторыямі былі даны аб гэтым загады, а цяпер, калі мова беларуская прызнаецца ўрадам роўнапраўнай, дык паўстае пытаньне, як будуць пісацца мэтрыкі ў царквах на будучы атчотны 1925 год.

Калі ўважаць, што Тымчасовыя Правілы ня могуць быць зьменены, і мэтрыкі, як акты гаспадарственага значэньня для Польскай Рэспублікі, павінны пісацца ў мове польскай, то Кансісторыі павінны загадаць, каб побач з ёй гэтыя акты пісаліся і ў мове беларускай, як акты грамадзкага значэньня для беларусаў, бо ўсе праваслаўныя, пражываючыя на тэрыторыі Крэсаў — беларусы (за малым выняткам праваслаўных расейцаў, элемэнту, закінутага сюды рознымі здарэньнямі жыцьця). А калі магчыма дапусьціць зьмену Тым. Прав. ў § 7, які датычыцца пісаньня мэтрык у дзьвюх мовах, уводзячы **адну** з прызнаных на Крэсах моваў, (для кожнай нацыі яе ўласную, у тым ліку й беларускую), то тады Кансісторыі павінны загадаць пісаньне мэтрык толькі па беларуску,—бо да гэтага часу ўсё праваслаўнае духавенства пры пісаньні іх, побач з мовай польскай, ужывала мову расейскую, — але-ж гэта мова ня ёсьць мовай тутэйшай (мѣстной) і ўжываецца зусім няправільна—тым больш, што мэтрыкі пішуцца тут для беларускага грамадзянства й сялянства, а не для расейцаў.

Належыць падбаць аб гэтым,—а Кансісторыі зьвярнуць увагу і аддаць пэўныя загады ў гэтым кірунку.

Весткі з вёскі.

З жыцьця работнікаў.

Гэленова, пад Маладэчнай.

У двары Гэленове, пад Маладэчнай, будуюцца казармы для войска. Работа гэтая аддадзена фірме „Будкрэс“.

Фірма за „старшых“ над рабочымі панаставіляла росных чарнасоценцаў, многа тут былых „выведоўцаў“, ёсьць і дэнікінскія афіцэры. Вось-жа, карыстаючыся нашай неарганізованасьцяй, нашае „начальства“ кожын дзень прымушае нас рабіць лішніх 15—20 мінут, а калі хто з работнікаў, маючы гадзіньнік, пратэстуе, дык такіх гоняць вон. Асабліва „стараецца“ нейкі Чарняўскі Міхал (б. дэнікінскі афіцэр).

Не ўдалося нам з'арганізавацца затым, што на работу панаехала сюды людзей з розных мейсц: і з Варшавы, і з Берасьця, і сьвянцянскія ёсьць, і віленскія,—усё розных паглядаў і настрояў. Але трэба спадзявацца, што сама праца і дазнаваныя крыўды скора вытварыць у ўсіх адзін супольны язык. Бо-ж б'юць нас тут адным бізуном, і роўна пападае і работніку беларусу, і паляку, і іншаму. А грамада нашая — не малая: душ за тысячу!

Плата нашая дужа малая, але некуды дзецца: каб не памерці з голаду, мусіш існаваць і рабіць за тое, што даюць.

Работнік з Гэнелова.

Асаблівы тэрор.

З Сіняўскае гміны, Нясьвіскага пав.

Нашы сяляне просяць Рэдакцыю падаць у газэце дзеля ведама нашых паслоў ніжэйпісанае:

У двары Начы невядомыя бандыты забілі двух паноў Сьвянціцкіх. Пасьля гэтага пачаліся ў бліжэйшых вёсках вобыскі і арышты. У досьвіткі налятае на вёску паліцыя і салдаты, акружаюць вёску і шукаюць бандытаў і аружжа... па шафах і скрынях! Уланы пускаюць каней карміцца ў авёс, езьдзяць па градох у гародах і ўсё нішчаць. А калі гаспадар што скажа, дык пагражаюць нагайкай, кажуць: „вас страляць трэба, вы—бандыты, пана Сьвянціцкага забілі!“ Пасьля арыштовываюць „падазроных“ сялян і гоняць у Сіняўку на дапрос,—а як той дапрос робіцца, вядома ўсім! Б'юць да бяспрытомнасьці, а то дзеля страху страляць ці вешаць маняцца...

Гэтак, нічога не дабіўшыся, выпусьцілі арыштаваных і сказалі: „ідзеце ў свае вёскі і скажэце, што, калі ня выдадуць аружжа і бандытаў, дык цераз 9 гадзін вёскі гэныя, што каля двара Начы, спалім“. Гэтыя вёскі: Ефітовічы, Перахрэсьця, Шчасновічы і Пашкаўцы. Але ніхто гэтаму не паверыў.

Назаўтрае, 1 верасьня, калі ў воласьці сабраліся солтысы, дык ім сказалі, што прыйшла тэлефонаграма ад ваяводы спаліць гэныя чатыры вёскі, дык каб усе сяляне пааддавалі, хто мае, карабіны, бомбы і інш. і каб паказалі на бандытаў. Але ніхто з сялян нічога ня мог аддаць ані сказаць, бо ня ведалі гэных бандытаў. 2 верасьня солтысы пайшлі ў гміну і сказалі камісару паліцыі з Нясьвіжу. Той і кажа: „Ну, дык вашыя вёскі будуць спалены!“—і паказаў у бок, дзе стаялі два броневікі і салдаты.—„Вось, кажа, ваша пагібель! На вясельле да вас прыедзем!“

Калі солтысы вярнуліся ў вёскі, паднялася страшэнная паніка. Гаспадары пачалі ўсё выносіць з хат, ды снапы вывазіць, каб хоць на насеньне мець зярно. А як у тую ноч быў дождж, дык усё замокла і дабро паглумілася.

На другі дзень паліцыя сказала, што далі нам яшчэ сроку дзесяць дзён. Вось мы і чакаем, што будзе.

Паслы! Заступіцеся!

Вясковец.

Сельска-гаспадарскія парады.

Як пазнаць, колькі каню гадоў.

Гады ў каня пазнаюцца па зьмене і зьяданьні пярэдніх зубоў. Да $2^1/_2$ гадоў век каня пазнаецца па прарэзаньні і зьяданьні малочных зубоў, а далей па прарэзаньні і зьяданьні сталых зубоў.

Жарабёнак найчасьцей родзіцца на сьвет без пярэдніх зубоў. У першыя два тыдні, ці крыху раней, у жарабёнка прарэзаецца па пары ўверху і ўнізу зубоў, якія называюцца **„захватамі“**. Цераз 3-6 тыдняў вырастаюць яшчэ па пары зубоў (па адным зубе па бакох захватаў) гэта **„сярэднікі“**. На 6-9 месяцы жыцьця ў жарабёнка прарэзаецца апошняя пара ўверху і ўнізу пара зубоў; гэта **„крайнікі“**. К канцу першага году крайнікі вырастаюць і робяцца роўнымі з сярэднікамі і захватамі. Такім парадкам **к канцу першага году свайго жыцьця жарабёнак маець па тры пары зубоў уверху і ўнізу аднолькавай велічыні.**

Далей век жарабёнка пазнаецца па зьяданьні ямачкаў на зубах, к $1^1/_2$ гадам у жарабёнка бываюць зьедзены ямачкі на захватах і на сярэдніках, а ў 2 гады ямачкі ня бываець ужо і на крайніках.

Каля $2^1/_2$ гадоў у жарабёнка ўверху і ўнізу вываліваюцца малочныя захваты і намейсца іх прарэзаюцца сталыя зубы. К 3 гадам сталыя захваты выраўніваюцца і перастаюць расьці.

К $3^1/_2$ гадам прарэзаюцца сталыя сярэднія зубы; к 4 году яны вырастаюць і робяцца роўнымі з захватамі.

К $4^1/_2$ гадам прарэзаюцца сталыя крайнікі; к 5 гадам крайнікі выраўніваюцца з астальнымі: к гэтаму прыблізна часу, а то крыху раней, у жарабцоў вырастаюць клыкі. Такім парадкам, **у пяць гадоў веку конь маець ужо ўсе сталыя зубы.**

Далей век каня пазнаецца па зьяданьні ямачкаў ці, як некаторыя завуць, кармікаў, або чашачкаў, на трох **ніжніх** парах зубоў.

У 6 гадоў ямачкі бываюць зьедзены на захватах (зьверху зуб бываець гладкі).

У 7 гадоў ямачкаў ужо няма і на сярэдніках, а

ў 8 гадоў зьядаюцца ямачкі і на крайніках. **У 8 гадовага каня ўсе чашачкі на ніжніх пярэдніх зубах бываюць зьедзеныя** (верх зубоў бывае роўны).

Пасьля 8 гадоў век каня пазнаецца па зьяданьні ямачкаў на верхніх зубах. Верхнія зубы, хоць прарэзаюцца разам з ніжнімі, але ямачкі на іх у два разы глыбейшыя, дзеля чаго і зьядаюцца шмат пазьней.

У 9 гадоў зьядаюцца ямачкі на верхніх захватах;

у **10 гадоў** — на сярэдніх зубах і

ў 11 гадоў у каня ўжо ня бываець ямачкаў і на ўсіх верхніх зубах. Значыць, у 11 гадовага каня верхнія і ніжнія зубы бываюць зьверху гладкія, без ямачкаў.

Пасьля 11 гадоў пазнаць век каня ўжо шмат цяжэй, і трэба ўжо мець практыку. Цяпер трэба зварачаць увагу на форму зубоў. Пасьля зьяданьня ямачкаў, зьедзены зуб паступова зьмяняець сваю форму, расшыраючыся і выцягваючыся.

Ад 12 — 18 гадоў зьедзеная паверхня зубоў з пацяглай пераходзіць у круглую форму;

ад 18 — 24 гадоў у трохкантовую і

ад 24 гадоў да канца жыцьця зубы маюць папярок пацяглую форму.

Я. П.

Друкарня **Н. Левін і Сын**, Вільня, Нямецкая 22.